В номере:

Нелегкое время для легкого пара



Старые заботы Нового Мира



«Три сестры» обновят «одежды»



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

№26 (10844)

6 красавіка 2019 года Субота

АДУКАЦЫЯ


Настаўніца Святлана Зацірка раздае заданні

# Алімпіяда ўзяла старт

Школьны аўтобус, прыпаркаваны на гімназічным двары, рэгістрацыя ўдзельнікаў на ўваходзе, просьбы захоўваць цішыню на паверхах, скарочаныя ўрокі для гімназістаў... Сёлета добрушская гімназія прыняла ўдзельнікаў другога этапа абласной алімпіяды па вучэбных прадметах для 4-9 класаў.

Падзея ў адукацыйнай сферы раёна – самая маштабная і па колькасці ўдзельнікаў, і па значнасці. Больш за 230 школьнікаў дэманстравалі веды па 14 прадметах – беларускай і рускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі...

Кожны з рабят, што з сур'ёзным выглядам заходзілі ў класы для выпрабавання ведаў – пераможцы ўнутрышкольных выпрабаванняў.

– Традыцыйна самая вялікая колькасць удзельнікаў, а значыць – і канкурэнцыя, сярод моваznаўцаў. Прыкметна павялічылася і колькасць рабят, якія пажадалі праверыць веды па грамадазнаўстве, – паведаміла намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Алена Журбянкова.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### Рэкорд памножылі на два

**Вучні гімназіі сталі ўладальнікамі сямі дыпломаў пятага Міжнароднага музычнага фестывалю "Новыя вяршыні". Днямі ён прайшоў у Мінску.**

Узнагароды розных ступеняў атрымалі ўсе ўдзельнікі добрушскай дэлегацыі – піяністкі Паліна і Ганна Бяліцкія, Анастасія Кіеня, Дар'я Гуцава, акардэаністка Дар'я Шаўчэнка, саксафаніст Станіслаў Шустаў, ансамбль "Вясёлка".

Мінулагоднія тры дыпломы лічыліся ва ўстанове адукацыі рэкордам. Сёлета інструменталісты пераўзышлі яго.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

### Прачытаў кнігу – перадай другому

**У гарадской СШ №1 стартавала акцыя "Падары бібліятэцы кнігу".**

Як паведамілі ў адміністрацыі навучальнай установы, бібліятэчны фонд састарэў і не здольны задаволіць усе запыты чытачоў. Таму адміністрацыя школы звярнулася да дзяцей і іх бацькоў з просьбай падзяліцца выданнямі дзіцячых пісьменнікаў з хатніх бібліятэк.

Дарэчы, у школе штотыднёва праходзяць мерапрыемствы, закліканыя абудзіць цікавасць дзяцей да чытання: гульнявыя праграмы, літаратурныя парады, экскурсіі па кніжных лабірынтах... Гэта прыносіць плён – за першае паўгоддзе навучальнага года кнігавыдача склала 2600 экземпляраў.

**Сяргей ВОЛЬГІН**

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 13.22
Луна
6 апреля – в Овне,
7, 8 – в Тельце


Первая четверть
12 апреля

**7 апреля**
НОЧЬЮ +3...+5
ДНЕМ +12...+14
Сплошная облачность.
Без осадков.
Ветер ю.-восточный 4-6 м/с.

**8 апреля**
НОЧЬЮ +6...+8
ДНЕМ +13...+15
Переменная облачность.
Возможен дождь.
Ветер ю.-западный 4-6 м/с.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# «Падвесці не маю права»




*Толькі месяц прайшоў, як галоўны аграном КСУП "Абарона" Максім Талкачоў узначаліў сельгаспрадпрыемства. Сустрэча журналіста "ДК" з ім прайшла ў разгар сяўбы.*

**– Максім Мікалаевіч, як склалася, што гарадскі юнак, выпускнік СШ №3 Добруша, звязаў свой лёс з зямлёй?**

– З ранняга дзяцінства любіў назіраць за прыродай. Урэшце, назваць дабрушаніна гарадскім можна толькі ўмоўна. Мае бацькі займаліся на дачным участку земляробствам. Дапамагаў ім і я. І не заўважыў, як "прывязаўся" да зямлі.

**– Што прывяло на працу ў Карму?**

– Пасля заканчэння сельскагаспадарчай акадэміі атрымаў накіраванне ў свой раён. З'явілася магчымасць выбару гаспадаркі. Спыніўся на Карме. Аграгарадок побач з Добрушам. Пяты год тут. І за гэты час ні разу не пашкадаваў аб сваім выбары.

**– З якімі праблемамі сутыкнуліся на пасадзе кіраўніка?**

– Асаблівых праблем няма. Рэсурс, напрацаваны тут былым кіраўніком, Васілём Антонавічам Шырко, дазваляе працаваць без аўралаў. У гаспадарцы дружны і зладжаны калектыў. Асноўная праблема – дэфіцыт кадраў. Чакаем на работу даярак, не хапае і кваліфікаваных механізатараў. Доўгі час адсутнічаў галоўны заатэхнік. Зараз гэта вакансія запоўнена.

Увогуле, хочаш нешта змяніць, – праяўляй цярпенне. Побач працуюць адданыя справе спецыялісты. У многіх з іх вучуся. Даводзіцца спасцігаць тонкасці жывёлагадоўлі, эканомікі, бухгалтарскага ўліку.

**– Як праходзіць сяўба?**

– Спакойна, без зрываў. Сёлета мы павінны пасеяць 50 гектараў проса, 25 – зернебабовых, 400 гектараў аўса. Работы выкананы на 80 працэнтах плошчаў. Займаемся таксама падкормкай азімых культур. Пшаніца і трыцікале займаюць больш за 1500 гектараў. Культуры добра перазімавалі. Праўда, апошнія начныя пахаладанні прыпынілі іх развіццё. Але спадзяёмся на лепшае.

**– Што для Вас зараз самае галоўнае?**

– Не падвесці сваіх настаўнікаў і ўсіх, хто давярае мне.

**Гутарку вёў Леанід ДУБОЎСКІ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

ПРИГРАНИЧЬЕ

# Вторая жизнь монумента?

**Уникальное сооружение – монумент Дружбы на границе России, Беларуси и Украины – было возведено в 1975 году на стыке Гомельской, Черниговской и Брянской областей.**



Так по задумке архитекторов будет выглядеть монумент Дружбы

На протяжении многих десятилетий здесь проходил крупнейший международный фестиваль «Славянское единство» и молодежный лагерь «Дружба». В связи с событиями в Украине проведение фестиваля дружбы вынужденно переносилось в различные районы Брянской и Гомельской областей. Памятник же, в обиходе – «Три сестры», со временем обветшал. С 23-метровых белых пилонов отлетает штукатурка, покосились бордюрные камни.

Задачу привести в надлежащее состояние монумент Дружбы в феврале этого года поставил Президент страны. И работа началась. Специалисты «Гомельгражданпроекта» разработали проект по ремонту и выдали рекомендации.

– Наша организация выступает основным заказчиком, – рассказывает директор «Добрушского коммунальника» Елена Смягликова. – Объем работ большой. Это требует привлечения квалифицированных специалистов. Сейчас ведем переговоры и определяемся, кто будет в роли генерального подрядчика.

Композиция облицована инкерманским камнем – натуральным песчаником, в свое время доставленным из Российской Федерации. Необходимо вручную провести очистку поверхности от отслаивающейся краски и декорирующих составов, затем укрепить покрытие, погрунтовать и покрасить. Работы эти – скорее реставрация, чем ремонт. Необходимой квалификации у добрушских коммунальщиков для их проведения нет.

Специалисты предприятия приступили к демонтажу тротуарной плитки. Общий объем покрытия – около трех тысяч квадратных метров. Согласно проекту, плитку заменят на новую, а к сооружению проложат дорожки в виде национальных орнаментов Беларуси, России и Украины.

– В порядок будут приведены и подъездные пути, газон возле монумента, – говорит Елена Смягликова. – Работы финансируются из областного бюджета.

**Сергей МИХАЙЛОВ**

НА СВЯЗИ

**8 апреля с 10.00 до 12.00 по телефону 3-20-97** пройдет прямая телефонная линия с участием Марины Александровны ЛАПИКОВОЙ, начальника отдела жилищно-коммунального хозяйства, архитектуры и строительства райисполкома.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Владимир Дворник назначен вице-премьером

**Президент Беларуси Александр Лукашенко назначил Владимира Дворника заместителем премьер-министра. Глава государства охарактеризовал Владимира Дворника как достаточно опытного человека, который прошел хорошую школу не только областного уровня, что важно для работы в руководстве правительства, но и в сфере сельского хозяйства.**

Владимир Дворник на посту вице-премьера будет в том числе курировать вопросы развития агропромышленного комплекса, лесного хозяйства, природных ресурсов и охраны окружающей среды.

Говоря о Гомельской области, Президент особо отметил свое отношение к жителям региона: «Оно всегда было не просто уважительное. Я с большой любовью отношусь к гомельским людям, потому что в свое время и пострадали они прилично, и выкарабкались мы вместе из этой беды. Гомельская область уже не та, что была, хотя, естественно, не без проблем». Президент выразил уверенность, что на пост главы региона будет найдена достойная замена, а пока основная нагрузка ляжет на первого заместителя председателя Гомельского облисполкома и помощника Президента в этой области. Глава государства обратил внимание Владимира Дворника, что даже на посту вице-премьера за ним останется Гомельская область в кадровом отношении, в плане помощи новому руководству по вхождению в курс дел.

# О справедливости, кадрах и коррупции

**Президент Беларуси Александр Лукашенко принял участие в открытии нового здания Верховного суда и совещании по совершенствованию деятельности системы судов общей юрисдикции.**

Совещание прошло в расширенном составе: его участниками стали руководители районных и городских судов, председатели и их заместители областных и общих экономических судов, начальники структурных подразделений Верховного суда, руководители нескольких министерств и ведомств, высшие должностные лица. Всего более 360 человек. По мнению Главы государства, широкий круг участников позволит обсудить на совещании все актуальные вопросы, которые стоят перед судебной системой, а своими мнениями смогут поделиться представители различных структур. «Не скажу, что я обозначу здесь ключевые направления, но скажу, что эти направления от жизни», – сказал он.

**По материалам БелТА**